Ліст полацкага падкаморыя Міхала Францковіча да віленскага ваяводы Крыштофа Радзівіла (погляд пасла ВКЛ на вальны сойм Рэчы Паспалітай 1590 г.) // Commentarii Polocenses Historici-Полацкія гістарычныя запіскі. – Т. 3. 2006. – С. 45–49.

*Уладзімір Падалінскі*

**Ліст полацкага падкаморыя Міхала Францковіча да віленскага ваяводы Крыштофа Радзівіла (погляд пасла ВКЛ на вальны сойм Рэчы Паспалітай 1590 г.)**

Вальны сойм Рэчы Паспалітай 1590 г., які адбываўся ў Варшаве з 8 сакавіка па 21 красавіка, быў передусім прысвечаны абмеркаванню захадаў па абароне краіны ў сувязі з магчымай вайной з Турцыяй і крымскімі татарамі. Надзвычай важным было і пытанне аб невыкананні эрцгерцагам Максімільянам умоваў Бытамска-Бендзінскага пагаднення, заключанага паміж прадстаўнікамі Рэчы Паспалітай і Габсбургаў 9 сакавіка 1589 г.

Падзеі, звязаныя са скліканнем і працай сойма 1590 г., разглядаліся галоўным чынам у польскай гістарычнай навуцы. Т. Кэмпа, К. Лепшы ў сваіх працах адлюстравалі важнейшыя пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, якія сталі тэмай абмеркавання ў Варшаве[1]. Падатковыя рашэнні сойма адзначаны ў даследаванні Г. Філіпчак-Коцур[2]. Я. Сэрэдыка звярнуў увагу на прадстаўніцтва сенатараў Рэчы Паспалітай на сойме 1590 г.[3]

У агульных рысах праца дадзенага вальнага сойма Рэчы Паспалітай закраналася таксама ў расійскай і беларускай гістарыяграфіі[4]. Аднак асобнага комплекснага даследавання, прысвечанага сойму і ўсёй соймавай кампаніі 1590 г., да сённяшняга часу не існуе. Верагодна, гэта звязана з даволі абмежаванай базай крыніц па дадзеным сойме. На жаль, нам не вядомы яго дыярыуш, як і пасольскія інструкцыі з паветаў ВКЛ[5]. Аб падрыхтоўцы склікання сойма і яго працы каштоўную інфармацыю нясуць эпісталярныя крыніцы: лісты караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы да канцлера

---

[1] Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł "Sierotka" (1549–1616) wojewoda wileński. Warszawa, 2000; Lepszy K. Walka stronnictw w pierwszych latach panowania Zygmunta III. Kraków, 1929; Idem. Rzeczpospolita w dobie sejmu inkwizycyjnego (1589–1592). Kraków, 1939.

[2] Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej 1587–1648. Projekty-ustawy-realizacja. Warszawa, 2006.

[3] Seredyka J. Senatorowie Rzeczypospolitej na sejmach Zygmunta III Wazy (1587–1632) // Rozprawy z dziejów XVI i XVII wieku. Poznań, 2003. S. 174; Idem. Ministrowie Rzeczypospolitej na sejmach epoki trzech Wazów (1587–1668) // Ibidem. S. 259.

[4] Жукович П. Сеймовая борьба православного западнорусского дворянства с церковной унией (до 1609 г.). Спб., 1901. С. 60–64; Падалінскі У. Палітычная эліта Вялікага Княства Літоўскага ў пачатку панавання Жыгімонта Вазы (1588–1591 гг.) // Acta Albaruthenica: Навуковы зборнік / Пад агульн. Рэд. М. Хаўстовіча, А. Баршчэўскага, С. Запрудскага. Вып. 5. Мн., 2005. С. 150–152.

[5] Вядомы толькі ўскосныя звесткі аб працы соймікаў ВКЛ перад соймам 1590 г.: Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 268; Lepszy K. Rzeczpospolita... S. 126.

pawet.net

ВКЛ Льва Сапегі, трокскага кашталяна Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі, Л. Сапегі і канцлера Кароны Яна Замойскага да віленскага ваяводы Крыштофа Радзівіла[6]. Канстытуцыі і падатковы універсал, прынятыя ў Варшаве, змешчаны ў Volumina Legum[7]. Важныя звесткі аб працы сойма і пазіцыі на ім прадстаўнікоў ВКЛ утрымлівае пратэстацыя, з якой выступілі паслы Княства хутка пасля завяршэння пасяджэнняў[8]. Некаторыя матэрыялы па сойме 1590 г. захаваліся ў Метрыцы ВКЛ[9]. Фрагментарныя звесткі падае хроніка пшэмысльскага біскупа Паўла Пясэцкага, створаная ў XVII ст.[10]

Яшчэ адной цікавай і фактычна невядомай крыніцай па працы дадзенага сойма з'яўляецца ліст соймавага пасла ад ВКЛ полацкага падкаморыя Міхала Францковіча да віленскага ваяводы Крыштофа Радзівіла з Варшавы ад 31 сакавіка 1590 г.[11]

Міхал Францковіч (Францковіч-Радзімінскі) з 1560-х гг. выступае як кліент (слуга) віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла Рудога, пры заступніцтве якога за ванную службу атрымліваў розныя зямельныя наданні[12]. За заслугі ў Інфлянцкай вайне ў 1583 г. быў прызначаны полацкім падкаморым, пасля смерці папярэдняга падкаморыя Анікея Корсака[13]. Падобна, што пасля смерці М. Радзівіла Рудога ён пэўны час быў кліентам яго сына Крыштофа, наступнага віленскага ваяводы[14]. Магчыма, М. Францковіч меў блізкія стасункі і з Л. Сапегам, бо быў жанаты на яго роднай сястры[15].

Жыгімонт Ваза склікаў вальны сойм Рэчы Паспалітай на 8 сакавіка 1590 г. у Варшаве. З-за спазнення соймавых лістоў, а таксама для большай зручнасці шляхце,

---

6 Archiwum Domu Radziwiłłów. Listy ks. M.K. Radziwiłła Sierotki–Jana Zamoyskiego–Lwa Sapiehy (далей - ADR). Kraków, 1885. S. 37–38, 99–100, 202–206; Archiwum Domu Sapiehów wydane staraniem rodziny (далей – ADS) / Wyd. dr. A. Prochaska. T.I (listy z lat 1585–1606). Lwów, 1892. S. 48–52, 56–57.

7 Volumina Legum (далей – VL). Przedruk źbioru praw staraniem XX. Pijarów w Warszawie od roku 1732 do roku 1782 wydanego: W 8 t. T. 2. Petersburg, 1859. S. 304–326.

8 Konopczyński W. Liberum veto: studyum porównawczo-historyczne. Kraków, 1918. S. 433–435.

9 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей – НГАБ). Ф. КМФ–18. Воп. 1. Спр. 283. Арк. 19адв.–20адв. Агульнае апісанне працы сойма і прынятых на ім рашэнняў утрымліваецца ў гаспадарскай інструкцыі на павятовыя соймікі перад соймам 1590/91 г.: Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie (далей – AGAD). Archiwum Radziwiłłów (далей – AR). Dział II. Nr. 239. S. 2–10, 13.

10 Kronika Pawła Piaseckiego biskupa przemyślskiego. Kraków, 1870. S. 96–100.

11 AGAD. AR. Dz. V. Nr. 3861. S. 4–6.

12 Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kancleris Mikalojus Radvila Rudasis (Apie 1515–1584 m.). Vilnius, 2002. P. 331–332, 373. Тут М. Францковіч памылкова названы Мікалаем.

13 Радаман А., Галубовіч В., Вілімас Д. Земскія ўраднікі Полацкага ваяводства (другая палова XVI–першая палова XVII стст.) // Полацкія гістарычныя запіскі. Т.1. 2004. С. 73; Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios... P. 331. Гэтую пасаду М. Францковіч займаў да сваёй смерці 12 сакавіка 1603 г.

14 У 1585 г. ён (дарэчы, кальвініст, як і біржанскія Радзівілы) быў віленскім намеснікам: Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy. T. 1: Województwo Wileńskie XIV–XVIII wiek / Pod red. A. Rachuby. Warszawa, 2004. S. 160. Пра сваю службу К. Радзівілу ўзгадвае у адным са сваіх лістоў і сам М. Францковіч: *"Былі часы, калі і па чатыры гады вашай міласці служыў, не беручы ні пенязя"*: AGAD. AR. Dz. V. Nr. 3861. S. 8. Аднак з сярэдзіны 1590-х гг. паміж полацкім падкаморым і віленскім ваяводам пачынаюцца маёмасныя канфлікты, якія нават даходзілі да судовых разбораў, напр. у 1596–1597 гг.: Ibidem. S. 11–15.

15 Sapiehowie. Materjały historyczno-genealogiczne i majątkowe: W 3 t. T. 1. Petersburg, 1890. S. 72, 145, 190–191. На жаль, як у айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіі няма біяграфіі М. Францковіча. Увага была звернутая толькі на двух з трох сыноў полацкага падкаморыя – Юрыя і Мікалая: Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2. Мн., 2006. С. 705; Polski Słownik Biograficzny. T. VII, z. 1–4. S. 99–100.

перадсоймавыя соймікі ў ВКЛ пераносіліся з 25 студзеня на 1 лютага і сумяшчаліся з дэпутацкімі соймікамі, а Галоўны соймік у Слоніме прызначаўся на 22 лютага 1590 г.[16] На адным з павятовых соймікаў паслом быў абраны і М. Францковіч. Цяжка вызначыць, прадстаўніком якога павета ці ваяводства ВКЛ быў полацкі падкаморы. Акрамя зямель у Полацкім ваяводстве, ён меў уладанні ў Віленскім, Лідскім, Навагародскім і Мазырскім паветах[17]. Заўважым, што М. Францковіч ужо меў вопыт парламенцкай дзейнасці. Улетку 1587 г. ён удзельнічаў у працы элекцыйнага сойма Рэчы Паспалітай, а ў лістападзе таго ж года браў удзел у пасяджэннях Галоўнага з’езда ВКЛ у Вільні[18].

Праграму працы сойма Жыгімонт Ваза ў асноўным акрэсліў у снежні 1589 г. Рэч Паспалітая апынулася ў складанай знешнепалітычнай сітуацыі. З аднаго боку, татары па загаду Турцыі і з-за інтрыг Маскоўскай дзяржавы гатовы былі ўварвацца ў межы краіны. З іншага, эрцгерцаг Максімільян так і не прысягнуў на ўмовы Бытамска-Бендзінскага акта і па-ранейшаму ўжываў тытул караля польскага. Акрамя таго, неабходна было разгледзець пытанне аб цяжкім стане скарбу Рэчы Паспалітай і вырашыць справы, адкладзеныя з мінулых соймаў[19]. Заклапочанасць небяспекай з боку татараў, набегаў якіх “чакалі” нават на землі Княства, ды дзейнасцю Максімільяна выказвала і палітычная эліта ВКЛ[20].

На вальным сойме 1590 г. прысутнічала даволі прадстаўнічая група сенатараў ВКЛ (13 чалавек, 48,2% ад усіх сенатараў-літвінаў): віленскі біскуп Юры Радзівіл, К. Радзівіл, віленскі кашталян Ян Кішка, трокскі ваявода Ян Глябовіч, М.К. Радзівіл, навагародскі ваявода (наміціраваны на гэты ўрад падчас сойма, 13 сакавіка) Фёдар Скумін-Тышкевіч, менскі, а з 25 сакавіка смаленскі кашталян Вацлаў Агрыпа, полацкі кашталян Вацлаў Шэмет, берасцейскі кашталян Адам Пацей, земскі маршалак Альбрыхт Радзівіл, Л. Сапега, падканцлер Габрыэль Война, земскі падскарбі (прызначаны 6 красавіка) Дзмітры Халецкі[21]. Акрамя М. Францковіча, нам вядомы яшчэ 9 земскіх паслоў Княства: войскі ашмянскі Мікалай Адаявец (пасол Віленскага ваяводства), Пётр Гарабурда (пасол

---

[16] ADS. S. 48–52. Паводле Статута 1588 г. соймікі ў паветах ВКЛ павінны былі склікацца за 6 тыдняў да пачатку сойма, г.зн. якраз 25 студзеня: Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. Мн., 1989. С. 115; Rachuba A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763. Warszawa, 2002. S. 76. Па асабістай просьбе К. Радзівіла соймік у Вільні склікаўся на некалькі дзён пазней за іншыя соймікі ВКЛ – 5 лютага: ADR. S. 205.

[17] Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios… P. 331, 373.

[18] Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. Warszawa, 2006. T. 1. S. 261, 266, 290.

[19] ADS. S. 48–49. Улетку 1587 г. у Рэчы Паспалітай былі выбраны адразу два каралі і вялікія князі: эрцгерцаг Максімільян Габсбург і шведскі каралевіч Жыгімонт Ваза. Барацьба паміж прэтэндэнтамі скончылася перамогай і каранацыяй Жыгімонта. Паводле Бытамска-Бендзінскага пагаднення, Максімільян павінен быў канчаткова адмовіцца ад усялякіх прэтэнзій на ўладу ў ВКЛ і Польшчы. Сойм Рэчы Паспалітай ратыфікаваў гэты акт у 1589 г.: Codex diplomaticus Regni Poloniae et Magni Ducatus Lituaniae. Vilnae, 1758. T. 1. S. 231–244; VL. T. 2. S. 278. Гл. таксама: Kempa T. Mikołaj Krzysztof... S. 274.

[20] У прыватнасці, М.К. Радзівіл і Л. Сапега: ADR. S. 37–38, 202–204.

[21] ADS. S. 56; Kempa T. Mikołaj Krzysztof... S. 277; Seredyka J. Senatorowie Rzeczypospolitej... S. 174; VL. T. 2. S. 305. К. Радзівіл прыбыў на сойм толькі пасля 12 красавіка: ADS. S. 56–57.

Віленскага ваяводства), ваўкавыскі староста, стольнік (з 11 красавіка – крайчы) ВКЛ Крыштоф Дарагастайскі (пасол Віленскага ваяводства), каралеўскі сакратар Станіслаў Лакніцкі, гарадзенскі падкаморы Рыгор Масальскі, гаспадарскі маршалак Абрам Мялешка, цівун віленскі Ян Пац, староста трэйдэнскі, цівун вяйшвянскі Пётр Стаброўскі, Андрэй Цеханавецкі[22].

Як і меркавалася пытанні, узнятыя Жыгімонтам Вазам у канцы 1589 г. і сталі галоўнымі пры абмеркаванні на сойме. *"Прапазіцыю ўчынілі,* – паведамляў К. Радзівілу М. Францковіч, – *найперш, аб абароне супраць турка, ... па-другое, аб забеспячэнні скарбу, па-трэцяе, аб ізаляванні (ад элекцыі ў Рэчы Паспалітай – Ул.П.) дому Ракузскага, ... на якія тры артыкулы былі прызначаны дэпутаты"*[23].

Адносна канфлікту з эрцгерцагам Максімільянам у Варшаве гучалі прапановы адхіліць ад будучых выбараў у Рэчы Паспалітай увогуле ўсю дынастыю Габсбургаў. У прыватнасці, да гэтага заклікаў Я. Замойскі, але былі і праціўнікі такога рашэння, напр., Ю. Радзівіл[24]. Ужо на 31 сакавіка сенатары і паслы ў цэлым прыйшлі да згоды: вырашылі пакуль забараніць удзельнічаць у элекцыі толькі Максімільяну, а імператару Свяшчэннай Рымскай імперыі Рудольфу II Габсбургу нагадаць, каб быў выкананы Бытамска-Бендзінскае акт. У адваротным выпадку, на наступным сойме ад выбараў караля і вялікага князя маглі б быць адхілены ўсе Габсбургі[25]. Канчаткова ў соймавыя канстытуцыі было ўнесена рашэнне аб забароне прэтэндаваць на ўладу ў Рэчы Паспалітай эрцгерцагу Максімільяну як зараз, так і падчас наступнага бескаралеўя, а тым, хто ўсё ж наважыцца парушыць гэтую пастанову, пагражала пакаранне як за абразу каралеўскай годнасці[26].

Полацкі падкаморы інфармаваў віленскага ваяводу аб прынцыповай пазіцыі паслоў Кароны, якую тыя занялі ў справе фінансавага забеспячэння каралеўскага скарбу: *"Паслы праз увесь час толькі прывілея патрабуюць, з-за чаго да ніводнай рэчы прыступаць не жадаюць"*[27]. Гаворка ішла аб перадачы некаторых даходаў і старостваў у Польшчы на забеспячэнне патрэбаў караля. У выніку, адпаведная канстытуцыя і была ўхвалена[28]. Заўважым, што аналагічнае рашэнне аб утварэнні эканомій у ВКЛ было абвешчана ў прывілеі Жыгімонта Вазы ў 1588 г. і зацверджана канстытуцыяй сойма 1589 г.[29]

---

[22] Konopczyński W. Liberum veto... S. 435; VL. T. 2. S. 306–307, 316, 325.
[23] AGAD. AR. Dz. V. Nr. 3861. S. 4.
[24] Kempa T. Mikołaj Krzysztof... S. 277.
[25] AGAD. AR. Dz. V. Nr. 3861. S. 4.
[26] VL. T. 2. S. 304–305.
[27] AGAD. AR. Dz. V. Nr. 3861. S. 5.
[28] Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 362–363; VL. T. 2. S. 312.
[29] Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией: В 39 т. Т. 7. Вильна, 1874. С. 94–97; Т. 8. Вильна, 1874. С. 262–263; НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 65. Арк. 277адв.–281; Спр. 72. Арк. 62адв.–63адв., 64адв.–65адв.; AGAD. AR. Dz. II. Nr. 214. S. 1–3; VL. T. 2. S. 289. Гл. таксама: Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 346–347.

pawet.net

Безумоўна, важнейшай задачай сойма было абмеркаванне захадаў па абароне Рэчы Паспалітай ад магчымай агрэсіі Турцыі і татараў. Для хуткага найму вялікага войска краіне патрабаваліся вялізарныя фінансавыя рэсурсы. Акрамя традыцыйных пабораў надзвычайным сродкам атрымання грошай мог стаць пагалоўны падатак з усіх жыхароў Рэчы Паспалітай. На час напісання ліста паслы яшчэ толькі чакалі канкрэтных прапаноў ад Жыгімонта Вазы і сената наконт памераў пабору. Зразумела, ухваленне новых значных падаткаў не выклікала аптымізму ў прадстаўнікоў шляхты. М. Францковіч непасрэдна адзначаў: *"Пана Бога просім, каб ад такога цяжкага і мудрагелістага пабору вольнымі быць маглі"*[30]. Ва універсале Жыгімонта Вазы ў паветы ВКЛ ад 5 красавіка 1590 г. чытаем: "… послове коро*н*ные и великого князъства литовъского жадъныхъ поборовъ и тежаровъ поступовати не хотели"[31]. Да таго ж, польскі бок для найму сваіх жаўнераў хацеў выкарыстаць грошы з падаткаў, ухваленых літвінамі на мінулым сойме 1589 г., а для найму жаўнераў ВКЛ прапаноўваў зацвердзіць новыя падаткі ў Княстве. Літвінам такая ідэя прыйшлася не даспадобы. *"На той пабор, які выбраны ў Літве, жаніхоў шмат, аб чым Пана Бога просім, каб ухаваў ад іх,"* – пісаў М. Францковіч[32]. Упартыя спрэчкі на гэты конт паміж прадстаўнікамі ВКЛ і Польшчы адбываліся як мінімум да сярэдзіны красавіка: літвіны не згаджаліся з прапановай палякаў і даводзілі, што новы пабор хутка сабраць у ВКЛ немагчыма з-за "вялікага ўбоства падданых"[33]. Тым не менш, зважаючы на пагрозы Турцыі разарваць перамір'е і пачаць вайну з Рэччу Паспалітай, сойм зацвердзіў пагалоўны, ланавы і чопавы падаткі, а тэрмін збору ў ВКЛ мыта "новападвышанага", прызначанага ў 1589 г., быў працягнуты да 11 лістапада 1591 г.[34] Акрамя таго, ВКЛ абавязвалася ў якасці пазыкі на ваенныя патрэбы выдаць 500 000 злотых польскіх (для Польшча сума пазыкі складала 1 000 000 зл.). З сенатараў і земскіх паслоў былі выбраны правізары, адказныя за збор і выдаткаванне грошай. Адным з правізараў, які павінен быў пастаянна знаходзіцца пры вялікім гетмане ВКЛ К. Радзівіле, стаў сам М. Францковіч[35]. Пра надзвычайную сітуацыю, у якой апынулася Рэч Паспалітая, сведчыць і тое, што літвіны нават ухвалілі на адзін год выплату "на ратаванне стала нашага" кварты (1/4

---

[30] AGAD. AR. Dz. V. Nr. 3861. S. 4–5.
[31] НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 283. Арк. 20.
[32] AGAD. AR. Dz. V. Nr. 3861. S. 5. Дарэчы, у Польшчы яшчэ перад соймам гучалі абвінавачванні ў бок літвінаў, што тыя, нягледзячы на ўсе просьбы, нічым не дапамагаюць палякам у змаганні з татарамі: ADR. S. 204. Такія закіды сустракаюцца таксама і ў лісце Я. Замойскага да К. Радзівіла: Ibidem. S. 99–100.
[33] Гл. лісты Л. Сапегі да К. Радзівіла з сойма ад 3 і 12 красавіка 1590 г.: ADS. S. 56–57.
[34] Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 235, 255, 268; VL. T. 2. S. 301–302, 319–326. На сойме былі прызначаны і паборцы ў большасці паветаў і ваяводстваў ВКЛ.
[35] Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 238, 240, 268; VL. T. 2. S. 306–308. Правізарамі ад ВКЛ сталі таксама сенатары Я. Глябовіч, Л. Сапега, Дз. Халецкі і паслы А. Цеханавецкі, Р. Масальскі.

даходаў) амаль з усіх гаспадарскіх уладанняў у ВКЛ[36]. Дарэчы, прадстаўнікі ВКЛ усё ж пагадзіліся выдаць палякам частку грошай, а дакладней 65 000 зл., з пабору 1589 г., а астатнюю частку накіравалі на наём уласных жаўнераў[37]. Таксама пры каралі і вялікім князі ствараўся дарадчы орган – Ваенная рада, якая павінна была займацца дачыненнямі з Турцыяй і татарамі (напр., вядзеннем перамоў, арганізацыяй паспалітага рушання і інш.)[38]. Праўда, большасць пастаноў сойма 1590 г., звязаных з падрыхтоўкай да вайны, была адменена наступным вальным соймам Рэчы Паспалітай 1590/91 г. у сувязі з нармалізацыяй адносінаў з Турцыяй[39].

Аднак для дэлегацыі ВКЛ на сойме 1590 г., разам з пытаннем абароны ад Турцыі і Крымскага ханства, было яшчэ адно надзвычай важнае пытанне – захаванне мірных адносінаў з Вялікім Княствам Маскоўскім (ВКМ). Жыгімонт Ваза быў сынам шведскага караля Ёхана ІІІ, а стасункі паміж Швецыяй і Маскоўскай дзяржавай у той час былі вельмі напружанымі. У студзені–лютым 1590 г. маскоўскія войскі вялі баявыя дзеянні са шведамі ў Фінляндыі і Эстоніі: захапілі некаторыя замкі, даходзілі нават да Рэвеля, няўдала спрабавалі ўзяць штурмам Нарву. У выніку, паміж краінамі было заключана перамір’е на год, паводле якога Швецыя саступала ВКМ Яму, Івангорад, Капор’е[40]. Была верагоднасць, што Жыгімонт Ваза захоча дапамагчы свайму бацьку і ўцягне Рэч Паспалітую ў новую вайну з Маскоўскай дзяржавай. Так, планы вайны з Масквой на сойме 1590 г. выношваў Я. Замойскі[41]. З іншага боку, вышэйшыя маскоўскія баяры ў сваіх лістах да Ю. Радзівіла, К. Радзівіла і Я. Глябовіча імкнуліся захаваць добрыя адносіны з палітычнай элітай ВКЛ[42].

Літвіны на сойме 1590 г. адназначна выступілі супраць ваеннага канфлікту з Маскоўскай дзяржавай. У сваім лісце М. Францковіч між іншым выказваў асцярогу, што ёсць людзі, гатовыя хутчэй выступіць супраць Маскоўскай дзяржавы, чым Турцыі[43]. Больш падрабязна аб пазіцыі прадстаўнікоў ВКЛ у гэтым пытанні можна даведацца з іншых крыніц. Земскія паслы Княства, і ў гэтым іх падтрымалі польскія паслы, згаджаліся на выплату пагалоўнага, ланавага і чопавага падаткаў, пазыкі ў 500 000 зл. і кварты з

[36] Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 259–260; VL. T. 2. S. 316. Ад кварты вызваляліся Гарадзенская і Берасцейская эканоміі, а таксама ўладанні, выдзеленыя на забеспячэнне каралевы Ганны.
[37] Filipczak-Kocur A. Skarbowość Rzeczypospolitej... S. 268; VL. T. 2. S. 316.
[38] VL. T. 2. S. 305–306. ВКЛ у Радзе прадстаўлялі сенатары Я. Кішка, Я. Глябовіч, Л. Сапега, Г. Война і Дз. Халецкі, а таксама земскія паслы: Я. Пац, Р. Масальскі, А. Цеханавецкі і А. Мялешка.
[39] Ibidem. S. 332.
[40] Карамзин Н.М. История государства Российского: В 3-х кн. Кн. 3. Т. 10. Спб., 1998. С. 325–328; Соловьев С.М. История России с древнейших времен. Кн. 4 (1584–1613). Т. 7. М., 2001. С. 305–306.
[41] Kempa T. Mikołaj Krzysztof... S. 277.
[42] У прыватнасці, гэтыя лісты былі накіраваны ад князя Фёдара Мсціслаўскага, Барыса Гадунова і Фёдара Раманава. Маскоўскі ганец Андрэй Іваноў быў выслуханы ў Вільні 9 лютага 1590 г.: Карамзин Н.М. История государства… С. 328; Соловьев С.М. История России… С. 306; ADR. S. 205–206; Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика / Liet. istorijos inst. Kn. 594: 1585–1600 / Parengė A. Baliulis. Vilnius, 2006. P. 95–97.
[43] AGAD. AR. Dz. V. Nr. 3861. S. 5.

гаспадарскіх уладанняў толькі пры ўмове, што Жыгімонт Ваза на гэтым сойме прызначыць пасольства, якое павінна будзе заключыць з Маскоўскай дзяржавай вечны мір або як мінімум зацвердзіць перамір’е, пастаноўленае сенатарамі ВКЛ і пасламі ВКМ на элекцыі ў жніўні 1587 г. Таксама літвіны прасілі зацвердзіць мір з Масквой адмысловай соймавай канстытуцыяй[44]. Жыгімонт Ваза імкнуўся ўлагодзіць паслоў і таму ўжо 5 красавіка 1590 г. у паветы ВКЛ быў накіраваны універсал, у якім апісвалася небяспека з боку Турцыі і ўтрымлівалася абяцанне адправіць “теперъ зъ со*й*му теперешнего пословъ нашых великих” да вялікага князя маскоўскага Фёдара Іванавіча, “с такою наукою абы о вечны*й* поко*й* тракътовали”[45]. Аднак перад самым закрыццём сойма аказалася, што рэальна нічога ў гэтай справе не зроблена. Тады земскія паслы адмовіліся прыступаць да канклюзіі і падалі ў канцылярыю ВКЛ пратэстацыю. Каб не дапусціць зрыву сойма, Жыгімонт Ваза паабяцаў усё ж адправіць паслоў у Маскоўскую дзяржаву і заключыць з ёй мір. Земскія паслы ВКЛ пасля такога абяцання і нарады са сваімі сенатарамі згадзіліся зацвердзіць усе падаткі, кварту і пазыку ў 500 000 зл. ды адступілі ад патрабавання ўхваліць спецыяльную соймавую канстытуцыю аб міры з Масквой[46]. Праўда, і пасля заканчэння пасяджэнняў Жыгімонт Ваза не спяшаўся выконваць сваіх абяцанняў, таму дэпутаты, адмыслова абраныя з ліку паслоў ВКЛ, хутка пасля сойма выступілі з пратэстацыяй, у якой заявілі, што пакуль іх патрабаванні аб заключэнні міру з Маскоўскай дзяржавай не будуць выкананы, то яны і ўся шляхта Княства “ні пад якія цяжары, тут на тым сойме пастаноўленыя, падлягаць не жадаем і не павінны будзем”[47]. У выніку, ужо 29 красавіка Жыгімонт Ваза накіраваў у Маскву ганца гарадзенскага стольніка Яна Дзевялтоўскага за глейтам для вялікага пасольства Рэчы Паспалітай, якое накіравалася ў Маскоўскую дзяржаву ўвосень 1590 г.[48] Літвіны праявілі прынцыповасць у абароне сваіх інтарэсаў і не дазволілі ўцягнуць краіну ў вайну, патрэбную Швецыі, а не ВКЛ. Верагодна, пра сойм 1590 г. пісаў К. Радзівіл у сакавіку 1591 г. трокскаму ваяводзе М.К. Радзівілу: *“Добра памятаю, што як у нашым сенатарскім, так і ў пасольскім коле на тым сойме, на якім найбольш палякі стараліся, каб перамір’е, намі на элекцыі з Масквой пастаноўленае, разбурыўшы ўшчэнт, вайну супраць яе пачаць, – усе абывацелі*

---

[44] Konopczyński W. Liberum veto... S. 433–434.
[45] НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 283. Арк. 19адв.–20адв.
[46] Konopczyński W. Liberum veto... S. 434.
[47] Не павінны былі пачынаць дзейнасці і правізары ад ВКЛ: Ibidem. S. 434–435. Дарэчы, супраць некаторых рашэнняў сойма пратэставала і частка польскай шляхты: Dzieje Sejmu Polskiego / Aut. J. Bardach, S. Grodziski, A. Gwizdz i in. Warszawa, 1993. S. 35; Konopczyński W. Liberum veto... S. 195, 255, 258; Opaliński E. Sejm srebrnego wieku (1587–1652). Między głosowaniem większościowym a liberum veto. Warszawa, 2001. S. 194, 234.
[48] Lietuvos Metrika. P. 98–156. Гл. таксама: Карамзин Н.М. История государства… С. 328; Соловьев С.М. История России… С. 307–311.

*народу нашага цвёрда тую вайну з Масквой не дазвалялі, не дапамагаючы такому прадпрыемству, якое разумелі за шкадлівае народу свайму”*[49].

Адзначым яшчэ некалькі момантаў, якімі быў адметны вальны сойм Рэчы Паспалітай 1590 г. Так, канстытуцыі, якія датычылі непасрэдна ВКЛ, былі вылучаны ў спецыяльны раздзел “Справы Вялікага Княства Літоўскага”[50]. Таксама падчас сойма праявіліся адасобленыя формы дзейнасці дэлегацыі ВКЛ: адбываліся асобныя нарады паміж сенатарамі і земскімі пасламі, прадстаўнікі шляхты Княства звярталіся да Жыгімонта Вазы з асобнымі ад палякаў просьбамі, а таксама выступілі з асобнай пратэстацыяй ад імя ўсіх паслоў ВКЛ[51]. Сярод іншых соймавых канстытуцый адзначым толькі адну, якая непасрэдна тычылася М. Францковіча. Пастанаўлялася, што межы Полацкага ваяводства неабходна ўдакладніць адпаведным падкаморым[52], г.зн. падкаморым полацкаму, браслаўскаму, ашмянскаму, менскаму, аршанскаму і віцебскаму.

Варта звярнуць увагу яшчэ на адзін момант з ліста М. Францковіча. Вядома, што ў сацыяльна-палітычным жыцці ВКЛ і Рэчы Паспалітай у XVI ст. была даволі шырока распаўсюджана такая з’ява, як пратэкцыянізм[53]. Полацкі падкаморы, з пэўнай доляй незадаволенасці, наступным чынам апісваў працу пасольскай ізбы на сойме 1590 г.: *“У нашым рыцарскім коле амаль усё дваранамі каралеўскімі і слугамі гетмана засадзілі, якія нічога іншага не робяць, толькі тое, што ім скажуць”*[54]. Гэта сведчыць аб тым, што ў Рэчы Паспалітай адносіны “патрон–кліент” актыўна выкарыстоўваліся як інструмент палітычнай барацьбы, у прыватнасці, у прадстаўнічых інстытутах улады.

Такім чынам, разглядаемы ліст М. Францковіча да К. Радзівіла ўтрымлівае досыць важныя і цікавыя звесткі па працы вальнага сойма 1590 г., паказвае настроі сярод паслоў у дачыненні да розных соймавых спраў, адлюстроўвае механізмы ціску на пасольскую ізбу з

[49] AGAD. AR. Dz. II. Nr. 244. S. 2.
[50] VL. T. 2. S. 316–317. Гл. таксама: Дружчыц В. Палажэньне Літоўска-Беларускай дзяржавы пасьля Люблінскай вуніі // Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў Менску. 1925. № 6-7. С. 248; Rachuba A. Wielkie Księstwo... S. 186; Wisner H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita. Szkice z czasów Zygmunta III i Władysława IV Wazy. Wydanie II. Warszawa, 2001. S. 59.
[51] Подолинский В.А. Великое Княжество Литовское в системе представительных органов власти Речи Посполитой: обособленные формы парламентской деятельности в последней трети XVI в. // Парламентаризм в Республике Беларусь: опыт становления и развития: сб. науч. статей / Ин-т парламентаризма и предпринимательства; под ред. В.А. Божанова. Минск, 2006. С. 57–59.
[52] VL. T. 2. S. 317.
[53] У польскай і літоўскай гістарыяграфіі гэтая праблематыка вывучаецца даволі актыўна. Сярод асноўных даследаванняў адзначым: Рагаускене Р. Радзивилл Рыжий и Радзивилл Сиротка: преемственность клиентуры в Великом княжестве Литовском в XVI в. // На шляхах да ўзаемаразумення. Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 15. Мінск, 2000. С. 209–215; Augustyniak U. Dwór i klientela Krzysztofa Radziwiłła (1585–1640). Mechanizmy funkcjonowania patronatu. Warszawa, 2001; Eādem. W służbie hetmana i Rzeczypospolitej. Klientela wojskowa Krzysztofa Radziwiłła (1585–1640). Warszawa, 2004; Kempa T. Urzędnicy i klienci Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia historica. Poznań, 2003. T. IX. S. 193–221; Mączak A. Klientela. Nieformalne systemy władzy w Polsce i Europie XVI–XVIII w. Wyd. 2. Warszawa, 2000; Idem. Rządzący i rządzeni. Władza i społeczeństwo w Europie wczesnonowożytnej. Wyd. 2, poprawione i uzupełnione. Warszawa, 2002; Ragauskienė R. Lietuvos Didžiosios...
[54] AGAD. AR. Dz. V. Nr. 3861. S. 4.

дапамогай пратэкцыяніcцкіх адносінаў. Вельмі важна, што гэты ліст дазваляе паглядзець на падзеі сойма з пункту гледжання прадстаўніка Вялікага Княства Літоўскага, дапамагае ацаніць стаўленне беларуска-літоўскай шляхты да важнейшых пытанняў унутранай і знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай.

pawet.net